УДК 930.2:27

# АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ ВІЗІТАЦЫІ РЫМСКА-КАТАЛІЦКІХ ПАРАФІЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1745–1754 гг.

**Сыцько Кірыл Валер’евіч,**
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

*У тэксце разглядаюцца асноўныя асаблівасці візітацыі рымска-каталіцкіх парафій на тэрыторыі Беларусі біскупам-суфраганам Антоніям Юзафам Жалкоўскім у 1745–1754 гг. Аналізуецца фармуляр акта візіты, аднаўляецца маршрут, па якім рухаўся картэж А.Ю. Жалкоўскага ў працэсе мерапрыемства.*

Візітацыі, пачынаючы з XVI ст. і да сённяшніх дзён, з’яўляюцца традыцыйнай формай кантролю з боку біскупа над гаспадарчай і літургічнай дзейнасцю парафій. Яны давалі і даюць уяўленне аб стане парафіяльнай сеткі, а таксама дазваляюць выявіць хібы з боку пробашчаў і своечасова іх выправіць.

Візітацыя парафій Віленскага біскупства ў 1745–1754 гг. на тэрыторыі Беларусі праводзілася з ініцыятывы біскупа-суфрагана Беларускага (лац. – Suffraganeus Albae Russiae) Антонія Юзафа Жалкоўскага, які быў прызначаны на пасаду на Віленскім сінодзе 11 лютага 1744 г. [3, с. 153] і меў неабходнасць азнаямлення са звесткамі аб стане падпарадкаваных яму касцельных адзінак. Разам з тым, мерапрыемства насіла кропкавы характар і ахапіла толькі 40 парафій, у



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

той час як у беларускай суфраганіі па стане на 1744 г. у 16 дэканатах налічвалася 240 касцёлаў [3, с. 175–194].

З дапамогай рэфармацыйных дэкрэтаў, а таксама завяральных запісаў Жалкоўскага аб правядзенні візітацыі, становіцца магчымым канструяваць маршрут візіты. Маршрут быў распланаваны на чатыры этапы, якія адбыліся ў 1745, 1746, 1748, 1754 гг. Першы этап пачаўся ў Дараве 21 ліпеня 1745 г., затым генеральны візітатар накіраваўся ў Ляхавічы – Сваятычы – Нягневічы – Клецк – Ішкалдзь – Мір – Слонім – Луконіцу – Дзярэчын – Масты – Ражану (Ружаны) – Ляцк – Каменку – Азёры – Васілішкі – Ваверку. Скончыўся этап у Жырмунах 13 лістапада, дзе была праведзена апошняя візіта за 1745 г. Другі этап візітацыі пачаўся ў Задвеі 4 жніўня 1746 г. і пралягаў праз такія населеныя пункты, як Камень (Валожыншчына) – Вішнева – Налібокі – Дзераўную – Свержань – Ялоўку (Ваўкавышчына) – Міжрэчча (Ваўкавышчына) – Мсцібаў – Рось – Ішчолну. Падчас трэцяга этапу быў правізітаваны толькі адзін касцёл у Здзецелі (Дзятлава) 28 жніўня 1748 г. Чацвёрты этап пачаўся ў чэрвені 1749 г. і ахапіў сабой наступныя населеныя пункты: Крэмяніца – Гнёзна – Шыдловічы – Рэпля – Эйсманты – Квасоўка – Адэльск – Крынкі – Малая Бераставіца – Вялікая Бераставіца. Пяты этап візітацыі 29 жніўня 1754 г. ахапіў толькі адзін касцёл у Раготна [1, арк. 259–281адв.]. Такая кароткая працягласць апошняй часткі візіты тлумачыцца тым, што восенню 1754 г. А. Ю. Жалкоўскі быў пераведзены на пасаду біскупа-суфрагана цэлай Віленскай дыяцэзіі, што прымусіла яго звярнуць увагу на парафіі іншых рэгіёнаў, якія ўваходзілі ў склад Віленскага біскупства.

Пры налажэнні перамяшчэння генеральнага візітатара на карту Беларусі можна заўважыць, што маршрутызацыя насіла дакладна прадуманы характар, што было зроблена з мэтай аптымізацыі затрат часу. Гэтым візіта 1745–1754 гг. адрозніваецца ад візітаў папярэдніх перыядаў (напрыклад, ад генеральнай візіты М. Слупскага 1673–1677 гг.), перамяшчэнні падчас якіх насілі нярэдка хаатычны характар [4, с. 480]. Падрабязна распрацаваны маршрут дазволіў візітатару наведваць некалькі касцёлаў за адзін дзень, ці візітаваць штодзённа не робячы перарываў, звязаных са знаходжаннем ў дарозе. Так, 21 ліпеня 1745 г. былі наведаны Дарава і Ляхавічы [1, арк.270], а касцёлы ў Рэплі, Эйсмантах, Квасоўцы, Адэльску павізітавалі 27–30 жніўня 1749 г. [1, арк. 280–280адв.] і г. д. Адзіным спрэчным момантам з'яўляецца трэці этап візіты, калі наведалі толькі адзін касцёл у Дзятлава ў 1748 г. Гэта можна патлумачыць тым, што ўсе паездкі ў 1745–1754 гг. праводзілі летам і восенню да наступлення маразоў. У Дзятлава візітатар павінны быў трапіць падчас папярэдняга этапу ў лістападзе 1746 г. (такое меркаванне грунтуецца на геаграфіі другога этапу), але не паспеў і паехаў у дадзеную парафію асобна.

Фармуляр актаў візітацыі 1745–1754 гг. збольшага паўтарае фармуляры папярэдніх мерапрыемстваў, якія праводзіліся Віленскімі біскупамі К. К. Бжастоўскім, А. Сапегам, М. Слупскім, Е. Тышкевічам, А. Войнам у 1633–1700 гг. Так, у акт уносіліся звесткі аб касцёле (апісанне алтароў, канфесіянала, баптызатэрыя, сакрыстыі, хораў, амбоны); аргентэрыі; медных, цынкавых і жалезных рэчах; літургічнай вопратцы і іншых рэчах з тканіны; абразах; літургічнай бібліятэцы; плябаніі; шпіталі; гаспадарцы [1, арк. 8–10адв.].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Галоўным адрозненнем ад фармуляраў папярэдніх перыядаў з'яўляецца грунтоўна распрацаваная, падзеленая на вялікую колькасць падраздзелаў частка, якая адносілася да гаспадарчай дзейнасці парафіі. Так, у актах візітацыі А. Ю. Жалкоўскага надзвычай падрабязна апісваліся зямельныя надзелы, фальваркі, касцельная юрыдыка, сенажаці, палі, балоты, рэкі, збожжа для насення, хатняя жывёла. Падрабязным станавілася таксама апісанне рухомай маёмасці – патрабавалася занатаваць нават колькасць лаў, вёдраў, зэдлікаў, гаспадарчага інвентару і г. д. Напрыклад, у пераліку маёмасці фальварку Грушаўка Ляхавіцкай парафіі пазначылі тры ложкі, шэсць сталоў, адну ванну, адну дзежку для хлеба, дзесяць піўных бочак, дзесяць кадак для варыва, адзін шуфель і інш. [1, арк. 16 адв.]. Занатоўваліся павіннасці сялян, падрабязна апісваўся склад прыгонных сем'яў і стан гаспадаркі. Дадаткова патрабавалася апісаць пляцы, паўпляцы і іншыя месцы, што знаходзіліся ў складзе касцельнай юрыдыкі [5, с. 103].

Падрабязнае апісанне нерухомай маёмасці і гаспадаркі, значна больш грунтоўнае за апісанні папярэдніх візітаў, тлумачыцца з кропкі гледжання праваздольнасці парафій, якая значна пахіснулася ў 1730-я–1760-я гг. Пробашчы дадзенага перыяду называлі гэты час не іначай, як «Сасскай анархіяй». Так, у Ішчальнскай парафіі ў 1730–1750 гг. гвалтам былі адабраныя зямельныя надзелы. Спачатку Жалудоцкі двор прысвоіў частку зямлі касцельнага фальварку Кукенішкі, уладальнікі Васілішак занялі частку зямлі парафіяльнай вёскі Юцёўцы, а пасля ўладальнік Гернік Юбілевіч свавольна захапіў кавалак касцельнага лесу, вырубіў яго і выкарыстоўваў як поле [2, арк. 3]. Укараненне практыкі падрабязных гаспадарчых апісанняў з пералікам і апісаннем зямельнай уласнасці ў актах візітацыі выглядае спробай доказу права на маёмасць касцёла ў выпадку рабавання парафіі і незаконнага заняцця парафіяльнай зямлі.

Такім чынам, візіта біскупа-суфрагана Антонія Юзафа Жалкоўскага ў 1744–1754 гг. насіла кропкавы характар і мела шэраг асаблівасцей у параўнанні з візітамі яго папярэднікаў. Так, упершыню быў дасканала распрацаваны маршрут аб'езду парафій, што стварыла магчымасці для эканоміі часу. Фармуляр візітацыйнага акту быў збольшага пераняты з фармуляраў папярэдніх гістарычных крыніц падобнага кшталту. Разам з тым, больш падрабязнымі і дасканалымі сталі апісанні гаспадарчай дзейнасці, а таксама маёмаснага стану парафій, што робіць акты візітацыі 1745–1754 гг. каштоўнай гістарычнай крыніцай, якая характарызуе парафіяльныя касцёлы як уласнікаў маёмасці.

## Літаратура

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 213.
2. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 1.
3. Synodus Dioecesana Vilnensis ab Illustrissimo, Exellentissimo ac Reverendissimo Domino D. Michaele Joanne Zienkowicz Dei & Apostolicae Sedis Gratia episcopo Vilnensi – Vilnae: Typis Mandata. – MDCCXLIV [1744]. – 194 p.
4. Wilczewski, F. W. Wizytacja diecezji wileńskiej przeprowadzona przez biskupa Mikołaja Słupskiego: czas trwania i zasięg / F. W. Wilczewski // Archiwa, Biblioteki I Muzea Kościelne. – 1999. – № 72. – S. 473 – 486.
5. Wilczewski, F. W. Wizytacje generalne diecezji wileńskiej w XVII–XVIII w. Ewolucja problematyki / F. W. Wilczewski // SOTER. – 2010. – №35 (63). – P. 99-109.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова